...валася само сабой? А...
..., кіраўнікі «Саўкам...
...не збіраліся плаці...
...х МФТ. А старшын...
...ння І. Асьмінін ув...
...пазіцыю, якую інак...
...юсоўнай, не назаве...
... з інтэрв'ю ён з...
...новы наймання б...
...даць правілам зах...
...ій. І тут жа перад...
...цтва такое тлумач...
...а працы экіпажа...
... МФТ не прада...
... магчымай». Аказ...
...ўкамфлот» меў н...
...ваць маракам то...
...энтаў зароблена...
...статняе перадаваць...
...вам і ў Дзяржбюдж...
...анутыя маракі заба...
... патрабаванні давял...
...іць. Але ж гэта а...
... забастоўкі працяг...
...ншых портах і кра...
... морах, дзе саве...

...»

...ракі

...днялі «зручны фла...
..., узважыўшы забас...
...траты, заходнія пр...
...кі перадаюць зак...
...ы больш салідн...
...м. І ці не атрыма...
...то хутка «Саўка...
...вогуле не будзе ч...
...аракам?
...а гісторыя, на м...
... яшчэ адно, на жа...
...е сведчанне некам...
... савецкіх гаспадар...
...дзеным выпадку М...
... СССР, і таго, што...
... сутнічае заканад...
...справядлівай апл...
...амежнага плаван...
... калектыў Нова...
...арскога параходст...
... да Вярхоўнага С...
...Р з просьбай пас...
...рэнне такіх закон...
... з адкрытай дыскр...
...маракоў.
...ырэй ставіць пыта...
... «Рабочая трибуна...
..., што парламент ...
...глядаць праблем...
...бока. Неабходна н...
...няць закон аб уе...
...дзе з краіны, аб р...
...цкіх грамадзян з...
...трэбны і пагаднен...
...рафсаюзаў з між...
... у прыватнасці ...
...ш, робіць вывад ...
...ованне ў сусветн...
...будзе і ў далейш...
...ацца стратамі і ця...
...ктамі.

Р. ХІЛТУНЕН.
(ІАН).

...аль, банкаўская с...
...ама не свабодна...
...аў. Крызіс у мета...
...рамысловасці, якая...
...медна-нікелевую сту...
...іў збавіць абарот...
... манетных дварах...
...а нам звычайны...
...пятнашак не будз...
... што тыраж Скары...
...бля па неабходнасці...
...межаваным.
...што мы маглі зра...
... папрасіць саюзны...
...павялічыць пастаў...
... Беларусь. Там, пэў...
... што Скарына наш...
...выдзелілі Беларусі...
...рублёў—прыкладна...
...і звычайнага. На...
...аў нумізматычных...
...этага, напэўна, не...
... як гаворыцца, чым...
... трапяць манеты...
...ргу?
...гістраваныя нуміз...
...убы і таварствы.

...конкурс-90



...ія замалёўкі.
Фота Сяргея ГАСПАДУРЫ (Ваўкавыск).





## Барыс ЕЛЬЦЫН



# СПОВЕДЗЬ НА ЗАДАДЗЕНУЮ ТЭМУ

**(Заканчэнне. Пачатак у №№ 137—174).**

Вада была страшэнна халодная. Сударгай зводзіла ногі, я ледзь даплыў да берага, хоць да яго ўсяго некалькі метраў. Выбраўшыся на бераг, паваліўся на зямлю і праляжаў на ёй пэўны час, пакуль апамятаўся. Потым устаў, ад холаду мяне трэсла, тэмпература паветра, мне здаецца, была каля нуля. Я зразумеў, што самому мне да дому не дабрацца, і паплёўся да паста міліцыі.

Хлопцы міліцыянеры, якія дзяжурылі на пасту, адразу ж мяне пазналі. Пытанняў яны не задавалі, паколькі я адразу ж сказаў, што нікому нічога паведамляць не трэба. Пакуль піў чай, які хлопцы мне далі, пакуль хоць крышку падсыхала адзенне, пра сябе лаяўся — да чаго дайшлі, але заявы не рабіў. Праз пэўны час за мной прыехалі жонка і дачка, і, развітваючыся, я яшчэ раз папрасіў міліцыянераў аб тым, што здарылася, нікому не паведамляць.

Чаму ж я прыняў такое рашэнне? Я лёгка прадбачыў рэакцыю людзей, якія з вялікай цяжкасцю церпяць маральныя правакацыі супраць мяне, але спакойна ўспрыняць вестку аб спробе фізічнай расправы яны ўжо не змогуць. У знак пратэсту мог спыніцца Зеленаград — а там большасць абаронных, электронных і навуковых прадпрыемстваў, спыніўся б Свярдлоўск — а там яшчэ больш ваенных заводаў, спынілася б палова Масквы... І пасля гэтага, у сувязі з забастоўкамі на стратэгічных прадпрыемствах, у краіне ўводзіцца надзвычайнае становішча. Пачынаецца «вечны і ідэальны парадак». Так дзякуючы таму, што Ельцын паддаўся на правакацыю, перабудова ў краіне магла «паспяхова завяршыцца».

Магчыма, гэта і не так. Магчыма, мой прынцып заўсёды і ўсюды гаварыць праўду і нічога не ўтойваць ад людзей не падвёў бы мяне і на гэты раз. Менавіта гэта больш за ўсё і здзівіла маіх выбаршчыкаў: я штосьці ўтойваю, чагосьці не дагаворваю...

Усё-такі лічыў, што людзі самі ўсё зразумеюць, ва ўсім самі разбяруцца. Тым больш, калі міністр унутраных спраў СССР Бакацін на сесіі Вярхоўнага Савета СССР дакладваў, што на мяне не быў ажыццёўлены замах, а ў доказ паведамляў фальсіфікаваную інфармацыю, гэта яшчэ больш усяляла ў мяне ўпэўненасць — народ ва ўсім разбярэцца. Бакацін чамусьці ўводзіў людзей у зман нават там, дзе факты лёгка правяраліся. Ён гаварыў, напрыклад, калі б пацярпеўшага сапраўды скінулі з моста, ён бы моцна разбіўся, так як вышыня — 15 метраў. Вышыня моста на самай справе — 5 метраў. І цяпер, каб словы міністра выглядалі праўдападобнымі, трэба тэрмінова будаваць новы мост, на дзесяць метраў вышэйшы за ранейшы. А гэтага рабіць ніхто не хоча. Нават у мэтах знеслаўлення Ельцына.

Увогуле, у мяне чамусьці была ўпэўненасць, што людзі адчуюць гэтыя шматлікія недарэчнасці і нестыкоўкі ў версіі кіраўніка МУС, зразумеюць, што ж здарылася са мной. І зразумеюць самае галоўнае — чаму я на сесіі сказаў: замаху не было.

І ўсё-такі я павінен сумленна прызнаць, правакацыя супраць мяне ў той момант удалася. Мае шматлікія прыхільнікі ў паніцы паведамлялі аб падзенні маёй папулярнасці. Тут жа на падрыхтаваную глебу была кінута плётка, што я ехаў да сваёй палюбоўніцы на дачу, якая чамусьці абліла мяне з вядра!.. Бязглуздзіца, лухта, вядома, але, напэўна, чым больш неверагодная выдумка, тым лягчэй у яе верыцца. Ды да таго ж, людзям часта хочацца пачуць якую-небудзь пікантную гісторыю, вось, маўляў, і перабудоўшчык закахаўся і галаву згубіў...

Пасля свайго міжвольнага купання ў ледзяной вадзе я на два тыдні дастаткова сур'ёзна захварэў: прастуда закранула лёгкае. Таму за часткай сесіі сачыў на экране тэлевізара. Відовішча, як высветлілася, вельмі сумнае. Асабліва ведаючы, наколькі вострая сітуацыя склалася ў краіне, як важныя цяпер, неадкладна, прынцыповыя рашэнні, якія, яшчэ ёсць шанц, могуць вывесці нас з крызісу.

Помню, як Юрый Афанасьеў на першым З'ездзе народных дэпутатаў востра і вобразна ацаніў толькі што выбраны Вярхоўны Савет, назваўшы яго сталінска-брэжнеўскім. Пры ўсёй маёй павазе да аўтара параўнання ўсё-такі не пагаджуся з яго ацэнкай. Наш Вярхоўны Савет не сталінска-брэжнеўскі — гэта хутчэй завышаная, а магчыма, і заніжаная ацэнка. Ён — гарбачоўскі. Поўнасцю адлюстроўвае непаслядоўнасць, баязлівасць, любоў да паўмер і паўрашэнняў нашага Старшыні. Усе дзеянні Вярхоўны Савет прадпрымае значна пазней, чым трэба. Ён увесь час спазняецца за адыходзячымі падзеямі, як і наш Старшыня.

Менавіта таму Вярхоўны Савет не вырашыў практычна ніводнай з пастаўленых перад ім задач.

Пад канец восеньскай сесіі, як бы ў павучанне нам, у трох сацыялістычных краінах рухнуў таталітарны сацыялізм, навязаны Сталіным гэтым дзяржавам пасля вайны. І амаль у насмешку над нашымі выпакутаванымі больш як чатырма гадамі перабудовы за лічаныя дні і ГДР, і Чэхаславакія, і Балгарыя зрабілі такі скачок з мінулага наперад да нармальнага чалавечага цывілізаванага грамадства, што ўжо і не зразумела цяпер, ці зможам мы іх калі-небудзь дагнаць. Разбураная Берлінская сцяна, новыя правілы ўезду і выезду, законы аб друку і грамадскіх арганізацыях, адмена артыкулаў у канстытуцыях аб кіруючай ролі камуністычнай партыі, адстаўка ЦК, скліканне нечарговых з'ездаў партый, асуджэнне ўводу войск у Чэхаславакію — усё гэта яшчэ чатыры гады назад павінна было адбыцца ў нас, і ўсе гэтыя гады мы топчамся на месцы, з перапудам робім крок наперад і тут жа адкочваемся на два скачкі назад.

Я вельмі рады, што ў нашых суседзяў у сацкраінах адбыліся такія перамены. Рады за іх. Але мне здаецца, гэтыя перамены прымусяць па-новаму і нас ацаніць тое, што мы так горда называем перабудовай. І хутка мы зразумеем, што засталіся на Зямлі практычна адзінай краінай «перамогшага нас сацыялізму», якая спрабуе ўвайсці ў новае XXI стагоддзе з аджыўшай ідэалогіяй стагоддзя XIX.

...Самыя апошнія падзеі. Па Маскве ходзяць чуткі, што на бліжэйшым Пленуме намячаецца пераварот. Хочуць зняць Гарбачова з пасады Генеральнага сакратара ЦК КПСС і пакінуць яму кіраўніцтва народнымі дэпутатамі. Я не веру гэтым чуткам, але ўжо калі гэта сапраўды адбудзецца, я буду біцца на Пленуме за Гарбачова. Менавіта за яго — свайго вечнага апанента, аматара паўкрокаў і паўмер. Гэта тактыка яго ў рэшце рэшт і пагубіць, калі, вядома, ён не ўсвядоміць гэтай сваёй галоўнай памылкі сам. Але цяпер, прынамсі, да бліжэйшага З'езда, на якім, магчыма, з'явяцца новыя лідэры, ён адзіны чалавек, які можа ўтрымаць партыю ад канчатковага развалу.

Правыя, на жаль, гэтага не разумеюць. Яны лічаць, што простым механічным галасаваннем, падняццем рукі ўверх ім удасца павярнуць гісторыю назад.

Вядома, цыркуляцыя гэтых чутак — сімптаматычная. Вялікая краіна балансуе на лязе брытвы. І ніхто не ведае, што адбудзецца ў ёй заўтра.

Чытачу гэтай кнігі крыху лягчэй, чым мне. Ён ужо ведае, што адбылося заўтра, дзе я, што са мной.

Ён ведае ўжо, што з краінай. І што з намі ўсімі...



Пераклад з рускай
Г. ДАУГАВЕСАВАЙ.

**Роздум Данііла Граніна аб кнізе Барыса Ельцына «Споведзь на зададзеную тэму» чытайце ў наступным нумары.**

# МІНСКІ АТЭП-7 ВА «БЕЛМАГІСТРАЛЬАЎТАТРАНС»

ГЭТА:

- *найкароткія тэрміны дастаўкі грузу ад склада да склада*
- *гарантыя захаванасці прадукцыі ў дарозе*
- *надзейнасць рухомага саставу*
- *высокі прафесіяналізм вадзіцеляў*
- *поспех на міжнародным*



● *поспех*

*на міжнародным*




РЭКЛАМА

Чырвоная змена

ТЭЛ. 32-50-01

Мінскі АТЭП-7 вытворчага аб'яднання «Белмагістральаўтатранс», доўгі час з'яўляючыся надзейным партнёрам знешнегандлёвага аб'яднання «Саўтрансаўта», прымае да перавозак экспартную прадукцыю прадпрыемстваў і арганізацый, якія маюць валютныя сродкі, паязнымі адпраўкамі ў краіны Усходняй і Заходняй Еўропы, у тым ліку Францыю, Італію, Швейцарыю, ФРГ, Галандыю, Бельгію, Данію, Аўстрыю, Грэцыю.

Перавозка ажыццяўляецца аўтапаяздамі з аб'ёмам кузава 62, 68, 74 $м^3$ грузападымальнасцю 20—25 тон.

Хуткаходныя «Мерседэсы» і «Івека», магутныя «СуперМАЗы» з тэнтавымі, цэльнаметалічнымі, нізкарамнымі паўпрычэпамі замежнай і айчыннай вытворчасці — да вашых паслуг.

За даведкамі звяртацца па адрасу:

220090, г. Мінск, вул. Алешава, 5, тэл. 62-02-11, 62-02-27, 62-14-04.

# Цярністымі сцяжынкамі

## УРЫВАК З АПОВЕСЦІ

**Журналіст Іосіф Чарняўскі ў 30-х гадах працаваў у «Чырвонай змене». У перыяд Вялікай Айчыннай вайны служыў у радах Савецкай Арміі, ваяваў на Заходнім, Паўночна-Заходнім, Калінінскім і Трэцім Беларускім франтах. Быў палітработнікам, афіцэрам разведаддзела фронта.**

**Аб дзеяннях савецкіх разведчыкаў у тыле ворага напісаў аповесць «Цярністымі сцежкамі», урывак з якой мы і прапануем нашым чытачам.**

I

УЖО два дні як Козараў быў у чарговым адпачынку: упарадкоўваў кватэру, рыхтуючы яе да прыходу Міраславы, з якой у яго адбыліся заручыны і пятнаццатага меркавалі пайсці ў загс.

У пятніцу, трынаццатага, Мікалай правёў Міраславу на вячэрні поезд: паехала ў родную вёску. З дзядзькам Андрэем і цёткай хацела падзяліцца радасцю — расказаць пра заручыны, запрасіць на вяселле.

З вакзала Мікалай вярнуўся дадому, калі начная цемра ахутала зямлю. На стале заўважыў запіску. Запаліў святло, узяў у рукі кавалачак паперы. На ёй было напісана: «Коля, званілі з Мінска. Табе заўтра трэба быць у ЦК. Сказалі, абавязкова. Нягледзячы на тое, што субота. Несцераў».

Кінуўся ў райком. Дзяжурны пацвердзіў тое, што было напісана ў запісцы. Мікалай хацеў пазваніць Несцераву, але дзяжурны паведаміў, што сакратар паехаў у гарнізон на вечар сустрэчы грамадзянскай моладзі з воінамі.

Усхваляваны Козыраў зняў трубку і папрасіў міжгароднюю злучыць яго з Мінскам, з ЦК камсамола.

**— Дзяжурны вас слухае.**

**— Добры вечар... Звоніць з Палеска Козыраў. Мяне выклікаюць у Мінск. Ці нельга адкласці паездку хоць бы на два дні?**

**— Я гэтага зрабіць не магу. Вы ў спісе, зацверджаным бюро. Скажу болей: усё санкцыяніравана партыйнымі органамі. Справа вельмі адказная. А дзесятай гадзіне раніцы просім быць у Мінску.**

**— А калі я пазваню сакратару?**

**— Ён скажа вам тое ж самае. Гэта рашэнне не аднаго сакратара, а бюро. Вы мяне зразумелі?**

**— Зразумеў.**

І Козыраў паклаў трубку. У задуменні зрабіў некалькі крокаў па кабінеце. Потым узяў ліст паперы, напісаў кароткае пісьмо Міраславе, паклаў у канверт, папрасіў дзяжурнага, каб заўтра аднёс па ўказанаму адрасу.

Тыдзень у сталіцы праляцеў у напружанай працы. У суботу, як толькі сцямнела, развітаўся з таварышамі і пайшоў на вакзал. Здавалася, што тут: у мітусні, хутчэй будзе ісці час.

Праз паўгадзіны Мікалай сядзеў ля століка ў сваім купэ. Адсунуў фіранкі, каб яшчэ раз глянуць на агні сталіцы. Успомнілася школа, дзе атрымаў сярэднюю адукацыю. Ад школы ў думках перабраўся на завод «Камунар», да слясарнага станка, на якім працаваў да прызыву ў Чырвоную Армію. Потым па Транссібірскай магістралі паехаў на Далёкі Усход, дзе два гады быў салдатам пагранічных войск і адначасова сакратаром камсамольскай арганізацыі камендатуры. Адтуль вярнуўся ў родную Беларусь, быў накіраваны на курсы.

І вось работа загадчыкам аргаддзела ў Палескім райкоме камсамола. Памятае, як аднойчы пазваніў Валодзя, камсамольскі важак з калгаса «Усход». Паведаміўшы, што ў суботу будзе сход, вельмі прасіў прыехаць.

— Якое пытанне выносіце на абмеркаванне? — пацікавіўся Козыраў.

— Каця Стаднюк раскажа аб паездцы на сельскагаспадарчую выстаўку ў Маскву.

— Абавязкова прыеду,—адказаў Козыраў.

На сход прыйшлі не толькі маладыя, а і члены калгаснага праўлення, камуністы. Расказаўшы пра тое, што бачыла на выстаўцы, Каця пачала гаварыць пра калгасныя справы. І раптам заявіла: «Мы дрэнна выкарыстоўваем сілы, якія нам дала прырода. Трэба ўключыць іх у справу. Карысць ад гэтага будзе вялікая».

**І прыгадала, як на выстаўцы ў Маскве бачыла, праўда, у мініяцюры, ірыгацыйныя збудаванні, якія паказваюць, як у некоторых гаспадарках краіны на рэках, нават рачулках, зрабілі дамбы і з дапамогай невялікіх гідравузлоў энергію вадападаў,ператвораную ў электрычную, па правадах пусцілі на жывёлагадоўчыя фермы, на асвятленне дамоў хлебаробаў. А дзе-нідзе магутныя патокі вады круцілі млыны, колы крупарушак, сукнавалак.**

**— Я прапаную, — закончыла сваё выступленне Каця, — пашырыць рэчышча нашай Паненкі. У дэфіле, што пераразае груды, зрабіць дамбу. Балота расчысціць. Атрымаецца добры вадаём, будзе свая, хоць і невялікая, электрастанцыя.**

Уцяміўшы сутнасць ідэі Каці, прамоўцы гаварылі і пра рыбныя стаўкі, пра тое, каб стварыць гусіную і качыную фермы, пра развядзенне андатры — вадзянога звярка з каштоўнай футрай. Дружна ставілі пытанне аб стварэнні стадыёна з басейнам для спартыўных спаборніцтваў. У пастанове сходу запісалі: «Прапановы Кацярыны Стаднюк адобрыць...»

На чарговым сходзе моладзі план канкрэтных работ, складзены камітэтам камсамола, быў аднагалосна зацверджаны. Самым старанным работнікам па добраўпарадкаванню Паненкі быў Валодзя—той самы, які прасіў «апусціць якар ля сэрца» Каці. Той нязграбны жарт яна даравала юнаку. Праўда, не адразу. Калі другі раз ён прызнаваўся ў каханні, Каця паставіла ўмову: «Дагоніш на спаборніцтвах у плавальным басейне, то, магчыма, і скажу «так». А потым яны пажаніліся. Добрая атрымалася пара.

За «Усходам» памяць павяла Мікалая ў калгас «Шлях да камунізму». Тут, у пакінутым асаднікам доме, камсамольцы абсталявалі клуб са сцэнай. Створаны імі драматычны гуртох падрыхтаваў спектакль па п'есе Янкі Купалы «Раскіданае гняздо». На раённым аглядзе самадзейных калектываў гурток гэты заняў прызавое месца, абставіў нават многія гарадскія калектывы.

Але Козыраву даводзілася займацца не толькі гэтымі пытаннямі. Раён быў прыгранічны, а гэта патрабавала самай пільнай увагі да аховы рубяжоў Радзімы. Трэба было лавышаць пільнасць не толькі пярвічных камсамольскіх арганізацый, але і ўсяго насельніцтва, нават дзяцей.

У памяці Мікалая ўсплыла такая незвычайная гісторыя. Летам мінулага года, калі дарослыя паехалі на аддаленыя сенажаці, каля вёскі Утыкалы з'явіўся невядомы чалавек. Падышоўшы да чарады дзяцей, якія гулялі ў лапту, незнаёмец запытаў: «Хлапчукі, у якім баку граніца?» Гульня спынілася, малыя сабраліся вакол чужака. Ён паўтарыў сваё пытанне. «Там»,—амаль што хорам адказалі хлапчукі, паказваючы рукамі ў процілеглы ад граніцы бок. І пачалі цікавіцца, адкуль ён прыйшоў, куды бярэ кірунак. А адзін з хлопчыкаў, крыкнуўшы «Бывайце, хлопцы, мяне мама чакае!», пабег у вёску.

Нечаканы госць, азіраючыся і аглядаючы мясцовасць, блытана адказваў малышам.

А мінут праз дзесяць убачыў; з вёскі ідуць два дарослыя і той малы, што пабег да маці.

— Ну, жэўжыкі, мне пара!—і незнаёмец паскораным крокам рушыў у бок граніцы. Але тут яго нагналі старшыня і сакратар сельскага Савета. Пад канвоем завялі на пагранічную заставу.

**Гэта быў пераапрануты ў грамадзянскую форму камандзір штаба пагранічнай акругі, які спецыяльна прыбыў на заставу правяраць пільнасць мясцовага насельніцтва. Начальнік заставы хітравата кіўнуў «незнаёмцу»: «Ну, як, перакаваліся, якое пільнае ў нас насельніцтва?» —і абодва рассмяяліся.**

**Заўсёды быць пільным! Гэтай мэце прысвячаліся і спецыяльныя гульні, прапанаваныя забаўнікамі з пагранатрада і актыўна падтрымання райкомам камсамола. У адну з такіх гульняў, як памятаў Козыраў, былі расстаўлены маладзёжныя пасты на галоўных магістралях, што вялі ў Палеск.**

Майская нядзеля. Паток фурманак, гружаных рознай спажывай, накіроўваўся ў горад, на кірмаш. Ехалі сем'ямі: мужчыны з жонкамі, дзецьмі. У незнаёмых камсамольскія пасты правяралі дакументы. Усё ішло гладка. Але паставыя ведалі, што сярод сялян маскіруецца «шпіён» і яго трэба было выкрыць.

«Шпіён» мінаваў два пасты, але ля самага горада быў выкрыты і затрыманы. Правяраючы даведку з месца работы, камсамолец Мікалайчук (трэці пост) заўважыў адну маленькую недакладнасць: у дакуменце было ўказана, што ён выданы 29 лютага 1941 года, але ж вядома, што такі лютаўскі дзень бывае толькі ў высакосны год.

Прыгадалася Козыраву і тое, як вяртаючыся з калгаса «Авангард», зайшоў у Глінскі сельсавет, каб пазваніць у райком камсамола. І тут сустрэўся з Данутай Асмалоўскай, якую нядаўна выбралі старшынёй выканкома сельскага Савета.

— Як працуецца?—запытаўся.

— Прывыкаю. Паступова акунаюся ў праблемы, вучуся, каб спраўляцца з ускладзенымі абавязкамі.

— Гэта добра, хвалю. А што новага ў вас?

— Ды, уласна кажучы, нічога цікавага не было. Хіба што...,—яна спынілася, быццам адшуквала словы, каб больш выразна выказаць свае думкі.

— Што — толькі?

— Ды вось учора рэгістравалі шлюб адной пары.

— Дык гэта ж цудоўна, што грамадзяне ідуць да вас дзеля гэтага.

— Добра яно то добра. Але смешна, што маладая старэйшая за маладога на дваццаць гадоў.

— Хто ж яна?

— Мясцовая хутаранка. А жаніх здалёк, недзе з-пад Брэста.

Паведамленне насцярожыла Козырава. Праз тыдзень, перад пачаткам нарады камсамольскага актыву раёна, ён запрасіў да сябе Асмалоўскую. Данута даведалася, што яе сігнал быў правераны органамі НКДБ. Аказалася, што малажавы муж хутаранкі—дзяржаўны злачынец, забіў дэпутата Вярхоўнага Савета рэспублікі, жыў пад чужым прозвішчам, па дакументах, украдзеных у Брэсцкім рамесным вучылішчы.

Прыклад, які заслугоўвае ўвагі камсамола. І пра яго Козыраў падрабязна расказаў на нарадзе сакратароў пярвічных арганізацый. Тут жа начальнік Палескага ўпраўлення НКДБ уручыў Данyце Асмалоўскай падарунак—іменны наручны гадзіннік.

АД УСПАМІНАЎ аб справах камсамольскіх у Палескай арганізацыі Мікалай зноў вярнуўся да выкліку ў Мінск, адкуль зараз вяртаецца дамоў.

«Так, паводле слоў сакратара ЦК, выказаных ім у гутарцы, мяне чакае перамена месца работы. І, бадай, не толькі месца. Новым будзе і сам профіль работы... Куды мяне хочуць перакінуць?»,—Козыраў спрабаваў гэта высветліць, але сакратар ухіліўся ад прамога адказу. «Прыедзеце на месца,—успамінаў Мікалай яго словы,—і вам скажуць усё ў райкоме. Прычым не ў камсамольскім, а ў райкоме партыі, як камуністу», Хіба пасля такога адказу задасі новае пытанне?

Мікалай не ведаў, што ў час яго знаходжання на семінары паміж Мінскам і Палескам адбылася размова кіруючых таварышаў. Пазваніў сакратар ЦК КП(б)Б у райком. Пацікавіўшыся падрыхтоўкай раёна да ўборкі ўраджаю, быццам між іншым запытаў:

— У вас ёсць камуніст Козыраў?

— Так, працуе ў камсамоле.

— Ну і як?

— Перспектыўны таварыш. Думаем забраць яго ў райком партыі загадчыкам аргаддзела.

— А чаму да гэтага часу так не зрабілі?

— Партстажу не хапала.

— А так работнік ён варты?

— Нават вельмі. Для нашага пагранічнага раёна сапраўдная знаходка. Дзякуй, што прыслалі яго сюды.

— Тады вось што, слухайце мяне. Наркома дзяржаўнай бяспекі рэспублікі папрасіў адпусціць Козырава ў яго органы. Цэнтральны Камітэт даў згоду на гэта. Калі Козыраў прыедзе з семінара ў Палеск, дайце яму магчымасць здаць камсамольскія справы і адразу ж адпраўце ў сталіцу.

— А як жа быць з загадчыкам аддзела райкома партыі?

— Калі не знойдзецца ў раёне, прышлём.

На гэтым размова скончылася: яна змяніла па сутнасці профіль работы Козырава.

...«У РЭШЦЕ РЭШТ, у рэшце рэшт, у рэшце рэшт»,—адстуквалі колы цягніка. Не распранаючыся, распусціўшы толькі каўнер гімнасцёркі, Мікалай прылёг на лаўку. Вагон раўнамерна пагушквала, і Козыраў заснуў.

Прачнуўся нечакана. Яго разбудзіў якісьці гул. Вагон здрыгануўся. Моцны штуршок скінуў Мікалая на падлогу. Балюча стукнуўшыся аб суседнюю лаўку, усхапіўся. У вагоне стаяў страшэнны шум. Козыраў выбег у калідор. Прабіраючыся праз стоўпатварэнне, усхваляваны праваднік рухаўся да дзвярэй.

— Грамадзяне! Усім выйсці з вагона,—усхвалявана паўтараў ён.

— Што здарылася?—спытаў у праваднікa Козыраў.

— Бамбяць, бамбяць!

Козыраў зразумеў, што пачалася вайна, пра магчымасць якой ім гаварылі на семінары.

Далей цягнік на захад не ішоў. Козыраву спадарожным транспартам давялося вяртацца ў Мінск.

**Іосіф ЧАРНЯЎСКІ**







МУЗЫЧНЫ ВЫПУСК

# НОТНЫ АРКУШ

№ 18 (165)

...асалон



...упае «Жывіца».

Фота П. Уладзімірава.

## АДКРЫТЫ ЛІСТ ДА НАМЕСНІКА МІНІСТРА КУЛЬТУРЫ БССР У. П. РЫЛАТКІ

Не паспелі прасохнуць подпісы на лісце т. Сігунова з фірмы «Мелодыя», які ён накіраваў на мой адрас, як рэдакцыя газеты «Чырвоная змена» атрымала новы—рэагаванне на артыкул «Аб'яднаем намаганні» за Вашым подпісам. Добрая нагода для аналізу абодвух.

Вы, шаноўны У. П. Рылатка, у сваім лісце паведамляеце пра запіс на студыі славутага «Полацкага сшытка». Але ж чаму ў лісце з фірмы «Мелодыя» пра яго не згадваецца? Мо таму, што на слэнгу кіраўніцтва «Мелодыі» словы «запісаць» і «выдаць» азначаюць не адно і тое ж? З гэтага парадоксу выцякае толькі тое, што «Полацкага сшытка» беларускія слухачы не дачакаюцца яшчэ год. Ратуе толькі тое, што «Полацкі сшытак» — твор вечны...

Шкада, што намеснік міністра культуры БССР робіць выгляд, што міністэрства мае нейкія адносіны да запісу альбома «Уліса», які зроблены ў Польшчы. Шкада, што ён робіць выгляд, быццам бы пераклаўшы на беларускую мову назву альбома «Сузорья» «Сентябрьская река», ён зробіцца больш беларускім, што «Гіт-парад» «БМ» можна назваць нацыянальным. На адну песню на роднай мове там запісана тры на «інтэрнацыянальнай»... Навошта хлусіць выканаўцам, слухачам і самім сабе? Мо больш прадукцыйна паставіць пытанне перад міністрам культуры т. Вайтовічам пра тое, што трэба будаваць сваю студыю, дый выходзіць на прамыя сувязі з заводам па вытворчасці плыт у Рызе? Хопіць быць у залежнасці ад «Мелодыі».

Ёсць у Вашым лісце і абнадзейваючыя ноты: «...Ствараюцца ўмовы для пачатку работы такой студыі...». Але ці будзе гэта сапраўдным выйсцем са становішча, калі яна будзе створана на грошы аднаго калектыву, на грошы, якія зароблены ўпартай працай і дзякуючы выканаўчаму майстэрству аркестра Міхаіла Фінберга? Напрыклад, я ўпэўнены, што гэтыя музыкі набудуць сабе такую студыю і паспяхова будуць запісваць свае шматлікія джазавыя і эстрадныя творы. Але ці будуць адчуваць сябе гаспадарамі ў ёй іншыя выканаўцы, хто яшчэ не мае валютных заробкаў?

Генеральны дырэктар «Мелодыі» В. Сухарада ў артыкуле «Знаки нотные и денежные» («Известия» ад 2 жніўня) не знаходзіць ніводнага слова ў падтрымку нацыянальнага мастацтва рэспублік. Але, сканцэнтраваўшы ўвагу на самых «хворых» для яго пытаннях — фінансавых — гучна дакляруе: «Мы, «Мелодия», не жаждем монополии. Пусть появятся конкурирующие фирмы — в условиях конкуренции работа будет более спорой...».

Вось так. Шляхі адчынены. Толькі пасля праведзенай «экспрапрыяцыі» ў 1961 годзе праз 30 гадоў кіраўніцтва «Мелодыі» дазволіла «шматпартыйнасць» грамзапісу. Як у выпадку са шматпартыйнасцю палітычнай, фірма «Мелодыя» сваёй маёмасцю, зразумела, дзяліцца не збіраецца. Маўляў, вы там у рэспубліках стварайце, што хочаце, а ў нас свае справы!

Наспела неабходнасць зноў вярнуцца да першаснага сэнсу словазлучэння «культурнае будаўніцтва», скараціць да неабходнага мінімуму колькасць дарагіх, але бесперспектыўных мерапрыемстваў у галіне культуры, а на зберажоныя грошы і валюту распачаць будаўніцтва важнай культурнай установы — Беларускай дзяржаўнай студыі грамзапісу. Без яе не задаволіць нарастаючы попыт на беларускі нацыянальны грамзапіс. Без яе не стварыць інстытут нацыянальнай тэлевізіі і радыё. Без яе не ўліцца ў еўрапейскі камунікатыўны працэс, не аднавіць наш сапраўдны культурны суверэнітэт!

З павагай
Анатоль МЯЛЬГУЙ.

...атак

## ...УХ УЖО НЕ СПЫНІШ

**...ыніўшы дзверы ў ... дзе звычайна ...ца ...аназменаўскае» ...днанне ...іцы», я пачуў ...тары. Сярод ... маладых ...аў сядзеў хросны ... беларускіх ... — Сяржук ...ў-Воюш, ...ваючы ...айную для сябе ...слухача.**

Спявала невядомая мне дагэтуль дзяўчына, акампануючы сабе на гітары:

**Я спрабую знайсці дзе-нідзе сваё выйсце,**
**На пясочку свой дом пабудую,**
**Дах пакрыю аджыўшым век лісцем,**
**Паспрабую, авось пашанцуе**
**Журавінавы колер, ды крык жураўліны,**
**Ды журба, ды жабрацкая годкая доля.**
**Дачакаюся ўлетку мо вольнай часіны,**
**А пакуль што няволя, няволя**
**На ілбе задуменна адбіта пячатка,**
**Адцурацца нягожа, застацца — нягожа**
**Адплачу я увосень слязьмі ўсе падаткі,**
**А вясною — няможна, няможна...**

Неўзабаве пачуў і маналогі маладой паэткі з гітарай.

«Вольга Акуліч, 17 гадоў. Самая звычайная біяграфія. Жыву ў Мінску, дзе скончыла самую сярэднюю школу, зараз вучуся ў БДУ. З дзіцячага ўзросту ўсе лічылі, што ў мяне няма ні слыху, ні голасу, таму ніякай музычнай адукацыі я не атрымала. Але неяк вырашыла, што мне трэба вывучыцца іграць на гітары, што і было зроблена...

...Напэўна, я дрэнна прыстасаваная да ўсялякіх клубаў. Калі з'яўляюся туды са сваімі песнямі на беларускай мове, усе робяць здзіўленыя вочы і кажуць: «А почему по-белорусски, если можно по-русски?» На што я звычайна адказваю: «А чаму не наадварот?» Пішу, спяваю сама. Калі спрабавалі арганізаваць тэатр «Сябрына» — крыху была ў ім. Пачалі мяне «выцягваць», але ж гэта несур'ёзна...»

ПЕРШЫ АЎТАРСКІ КАМЕНТАР: Як высвятляецца, мы ўжо бачыліся раней. У час аднаго з першых канцэртаў «Сябрыны» на сцэну выйшла дзяўчына ў вышыванай кашулі і заспявала нешта наконт улады салавецкай. Новы ўздым кан'юнктуршчыны ці спроба стварэння беларускага лагернага фальклору? — падумалася мне тады.

Зноў маналогі:

«...Мала хто ў нас чытае вершы, за выключэннем невялічкага кола аматараў. А бардаўская песня — гэта ж плынь паэзіі. Слова сказанае, тым больш заспяванае, зусім інакш даходзіць да свядомасці. Музыка тут не адыгрывае такой ролі, як на эстрадзе. Асноўнае — гэта тэкст. У бардаўскай песні ёсць розныя плыні, але свае словы, свая музыка — тым яны і каштоўныя. Вось я сама займаюся рамансамі і больш ні на што не прэтэндую. Раманс — гэта і ёсць бардаўская песня мінулага стагоддзя, а ў нас гэты напрамак амаль не распрацаваны. Тут няма вялікай глыбіні думкі, нейкай асаблівай філасофіі — гэта пачуцці...

...Прыклады? Дык зараз жа ў нас у асноўным спяваюць мужыкі. Няўжо мне — з іх браць прыклад? Атрымаюцца рамансы ў маршавым стылі...

...Тое, што пішу, не афішырую. Я ж у час лекцый не спяваю, спяваю сярод тых, хто мяне добра ведае. Альбо калі гэта нейкі канцэрт, дык людзі ведаюць, што хочуць пачуць...

...Калі напішаш нешта не надта ўдалае і чуеш пра гэта ад іншых, дык спачатку крыўдуеш, а потым—нічога. Асабліва, калі пройдзе нейкі час, ну месяц які.

...А тое, што падабаецца самой?»

**«...А тое, што падабаецца самой?»**
**Не чакаю, не ўзгадваю,**
**Ён паехаў далёка...**
**Яблык падае з яблыні,**
**Не прыходзіць палёгка.**
**Тут блукае па восені**
**Пах бурштынавых хвояў,**
**І здаецца мне — возера,**
**А ў глыбі — мы з табою.**
**Зверху — неба ў сто колераў,**
**Знізу — кветкі-каменні...**
**Мы з табою у возеры,**
**А ў жыцці — нашы цені.**



ДРУГІ АЎТАРСКІ КАМЕНТАР: лірык Камоцкі, рамантык Мельнікаў, ваяр Сокалаў-Воюш, узыходзячая зорка Лера Сом — іх зусім няшмат, беларускіх спяваючых паэтаў. Але рух, які пачаўся, ужо не спыніць. І, можа здарыцца, на роўных з гэтымі імёнамі загучыць новае — Вольга Акуліч.

У. ПАНАДА.
Фота аўтара.

## КІНААФІША

### «ШЧАСЛІЎЧЫК»

Асабліва ўмацавалася ў савецкім кінематографе 70-х тэма няправільна пражываемага жыцця. Найбольш значнымі героямі аказаліся тыя, хто разбазарваў час, растрачваў сябе ўпустую. Рыкашэтам стрэлы праблемы ляцелі ў моладзь, але да 80-х гадоў яны ўсё часцей пачалі трапляць у шчыты папрокаў старэйшаму пакаленню, і не толькі яму. Некаторыя фільмы яшчэ па інерцыі абураліся маладымі, спрабавалі перасцерагчы. Але з'явіліся «Ці лёгка быць маладым?», «Маленькая Вера», «Ступень»... У кантэксце з імі ўсё больш няёмка было звальваць віну на адны плечы. І кінематограф прэтэнзій да моладзі, што разагнаўся, як бы затармазіў, атрымаўшы магчымасць публічна разважаць аб прычынах, якія не даюць ёй ажыццяўляцца.

Новая каляровая мастацкая кінастужка «Шчасліўчык» вытворчасці кінастудыі «Ленфільм» магла б прадоўжыць вызначаную тэндэнцыю адказваць на пытанні «чаму?», растлумачваць сітуацыю 80—90-х гадоў. Але сцэнарыст Анатоль Усаў і рэжысёр-пастаноўшчык Валянцін Мішаткін узялі папярэдні часовы пласт развіцця кіно, калі было прынята перасцерагаць. І не заўважыўшы, што гэты этап ужо пройдзены, старанна пачалі кляйміць злачынную легкадумнасць моладзі.

Галоўны герой кінарасказу—малады аўтамеханік Ваня Нечкін, які нядаўна вярнуўся з арміі і вырашыў падзарабіць грошай сумніцельным шляхам.

У фільме здымаліся Мікалай Стоцкі, Ірына Клімава, Алена Сафонава, Яўген Лазараў.

### «АДЗІНОКІ ПАЛЯЎНІЧЫ»

Так называецца новая каляровая двухсерыйная мастацкая кінастужка, створаная рэжысёрам Кеці Далідзе на кінастудыі «Грузія-фільм» па сцэнарыю Мікіты Міхалкова, Віктара Мярэжкі і Аляксандра Адабаш'яна.

Гэта псіхалагічная кінадрама пра маладога чалавека, які ўступіў у няроўную барацьбу з падонкамі, што наладзілі гвалтаванне над яго жонкай.

Андро ўдаецца адшукаць нягоднікаў, якія здзейснілі сваю чорную справу. Спачатку яны не разумеюць небяспекі, якая пагражае ім, бо не сумняваюцца, што змогуць адкупіцца. Але ў ходзе сустрэчы ў загарадным доме герой рыхтуе пастку для сваіх «гасцей»...

У галоўных ролях заняты Зураб Кіпшыдзе, Нінель Чанкветадзе, Кахі Каўсадзе, Марына Джанашыя.

### «ДОПІНГ ДЛЯ АНЁЛАЎ»

...Клаўдзій Іванавіч Радзімцаў, радавы служачы, сціплы працаўнік, нечакана трапляе пад шквал неверагодных падзей, якія абрушваюцца на яго двума патокамі.

Па-першае, яму з'яўляецца анёл, які абяцае за сціпласць і непатрабавальнасць Клаўдзія Іванавіча ўзнагароду, нейкія адчувальныя даброты.

Па-другое, — і гэта ўжо рэальнасць — Радзімцаў пачынае атрымліваць шчодрыя падарункі ад невядомых добразычліўцаў: то пад дзвярыма кватэры знаходзіць пакунак з харчовым звышдэфіцытам, то на неасвоеным дачным участку вырастае церамок, а ля ўваходных дзвярэй аказваецца запіска, што, маўляў, гэта так, часовае жыллё, а ў далейшым тут будзе ўзведзены сапраўдны фінскі катэдж...

Клаўдзій Іванавіч падазрае, што гэта і ёсць абяцаная анёльская дапамога, але неяк ад гэтых знакаў увагі яму робіцца не па сабе... А пра тое, што адбылося далей, вы даведаецеся, паглядзеўшы новую каляровую трагікамедыю «Допінг для анёлаў», створаную рэжысёрам Уладзімірам Папковым на Кіеўскай кінастудыі імя А. П. Даўжэнкі па сцэнарыю Рамана Фурмана і Алега Калеснікава.

У фільме здымаліся Альберт Філозаў, Лія Ахеджакава, Ларыса Удавічэнка.

### «ЛЕГЕНДА ПРА МАЦІ»

Вытворчасць Студыі мастацкіх фільмаў, В'етнам. Аўтар сцэнарыя і рэжысёр — Баць Зіеп.

У гады амерыканскай агрэсіі в'етнамка Хыонг працавала ў бальніцы, размешчанай на акупіраванай тэрыторыі. Жанчына жыла ў пастаянным страху за сябе і за мужа, які ваяваў у партызанскім атрадзе. Аднойчы з бальніцы, пакінуўшы нованароджанага, уцякла жанчына-камуністка, за якой палявала паліцыя. Хыонг, усведамляючы небяспеку такога кроку, узяла дзяўчынку на выхаванне. А праз пэўны час усынавіла хлопчыка, маці якога памерла ў час родаў. Хутка Хыонг узяла яшчэ адно дзіця, маці якога была падпольшчыцай і загінула пры выкананні задання. Сям'я Хыонг, якая хутка расла, выклікала падазрэнне паліцыі. Нягледзячы на цяжкасці, Хыонг самаадданна выхоўвала траіх дзяцей... Закончылася вайна. Муж загінуў, а дзяцей адшукалі іх блізкія сваякі, і Хыонг давялося развітацца з названымі дочкамі і сынам.

Ролі ў фільме выконваюць Ча Жанг, Чонг Хой, Нгок Біць, Нгок Хіен.

*МАЗАІКА*

### БРАНДО ВЯРТАЕЦЦА Ў КІНО

«Хросны бацька» вяртаецца на экран. Не, гаворка ідзе не пра вядомы фільм, а пра выканаўцу галоўнай ролі — Марлона Брандо. Восем гадоў ён не паказваўся ў промнях юпітэраў. Чуткі пра акцёра хадзілі самыя супярэчлівыя. Адны сцвярджалі, што Брандо заплыў тлушчам і рэгулярна робіць прагулкі па Беверлі-Хіл з даверху нагружанымі прадуктамі цялежкамі з супермаркета...

Другія, наадварот, гаварылі, што ён у пакутах скідвае сваю залішнюю вагу, каб вярнуцца ў Галівуд.

І вось 65-гадовы Брандо зноў паўстаў перад камерай, абвяргаючы ўсялякія выдумкі: ён зноў здымаецца і зусім не пахудзеў. У новым фільме—камедыі «Навічок» Брандо выступае ў ролі боса мафіі — «хроснага бацькі», які бярэ пад апеку вясковага хлопчыка з мэтай зрабіць яго сваім пераемнікам. Для новай ролі — такі ўжо Галівуд! — акцёру давялося навучыцца катацца на каньках. Відавочцы сцвярджаюць, што, нягледзячы на вагу, рабіў ён гэта з уласцівай яму грацыёзнасцю...

НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма «ДОПІНГ ДЛЯ АНЁЛАЎ».



## ТЭЛЕБАЧАННЕ

### 9, НЯДЗЕЛЯ

**Першая агульнасаюзная праграма**

7.00. Спорт для ўсіх.
7.15. Рытмічная гімнастыка.
7.45. Тыраж «Спортлато».
8.00. Раным-рана.
9.00. На службе Айчыне.
10.00. Ранішняя пацяшальная праграма.
10.30. Клуб падарожнікаў.
11.30. Здароўе.
12.15. Музычны кіёск.
12.45. Фільм «Паўднёвыя вароты аграхіма».
13.05. «Прыгоды Тома Соера і Геклыберы Фіна». 3-я серыя.
14.10. Сустрэча з паэтам Віктарам Бокавым.
15.10. Фотаконкурс «Зямля — наш агульны дом».
15.15. Сельская гадзіна. Панарама.
16.30. Марафон-15.
18.00. «Кале і Бука». Мультфільм.
18.25. Маст. фільм «Няўзброеным позіркам». (ЗША).
20.00. Час.
20.40. Тэлевізійнае знаёмства. Акадэмік Д. С. Ліхачоў.
22.00. Футбольны агляд.
22.30. Канцэрт Лаймы Вайкуле.
23.30. «Нябесныя ластаўкі». Маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
1.40. Канцэрт Лаймы Вайкуле.

**Праграма Беларускага тэлебачання**

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Падалянка». Фільм-канцэрт.
9.15. Парады ўрача. Стрэс.
9.30. «Боль малочнага зуба». Маст. фільм.
10.55. «Ветка вярбовая, ветка цярновая». Дак. фільм.
11.20. Вас выклікае Спартландыя.
12.35. Інтэрэкран. Прадстаўляе тэлебачанне Казахстана.
13.25. Эстафета чэмпіёнаў. Віталь Шчэрба. Спартыўная гімнастыка.
14.00. Аздараўленне беларускіх дзяцей у ГДР.
14.45. Нашы госці. Адэскі рускі драматычны тэатр імя А. Іванова.
15.45. «Мама». Маст. фільм.
17.10. «Сніўся мне сад». «Полацкая пячатка».
17.30. Францыск Скарына ў Полацку. Урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 500-годдзю Францыска Скарыны.
19.00. Панарама.
19.20. Д. Смольскі. «Францыск Скарына». Фільм-опера БТ.
20.35. Тэлетыдзень: праграма дзень, час.
20.45. Калыханка.
21.05. Кінастужкі мінулых гадоў. «Падкідыш».
22.15. Дзённік урачыстасцей, прысвечаных 500-годдзю Францыска Скарыны.

**Другая агульнасаюзная праграма**

7.00. На зарадку станавіся!
7.20. Мультфільмы «Як вярблюдзяня і ослік у школу хадзілі», «Казляня, якое лічыла да дзесяці», «Кот у каўпаку».
7.45. Песні Верхняга Дона.
8.25. Зямля трывогі нашай. «Уздоўж і ўпоперак Дняпра», «Заложнікі».
9.00. Фільм — дзецям. «Прыгоды маленькага Мука».
10.10. «Спартыўны фестываль у Аўтаградзе». Дак. фільм.
10.30. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
11.30. «Мы разам, мама». Маст. фільм.
12.40. Калі вам за...
13.30. Відэаканал «Савецкая Расія».
16.00. Планета.
17.00. І. С. Бах. Брандэнбургскі канцэрт № 4.
17.25. «Спатканне назначыла Таццяна Шмыга». Музычны фільм.
19.00. Добрай ночы, малышы! «Хітрая варона».
19.15. Вольная барацьба. Чэмпіянат свету.
20.00. Час (з сурдаперакладам).
20.40. Маст. фільм «Мае людзі».

## НАДВОР'Е

СЕННЯ ДНЕМ ПА РЭСПУБЛІЦЫ ЧАКАЕЦЦА ВОБЛАЧНАЕ З ПРАЯСНЕННЯМІ НАДВОР'Е, МЕСЦАМІ КАРОТКАЧАСОВЫЯ ДАЖДЖЫ. ТЭМПЕРАТУРА ПАВЕТРА—13—18 ГРАДУСАЎ, ПА ПАЎДНЁВАМУ ЎСХОДУ—ДА 21, У МІНСКУ—15—17.

Калектыў рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» выказвае глыбокае спачуванне супрацоўніцы рэдакцыі ЗІНОВІЧ Марыі Ільінічне з выпадку смерці маці.

Навіны кінаэкрана

## «Мы ўслаўляем жанчыну...»

...Фігура ў спецадзенні ў рознакаляровых фантанах ядавітых фарбавальнікаў. Цэх афарбоўкі бакаў аўтазавода. Працуе... жанчына...

Напоўнены яркім святлом салон фатографа. Камера настойліва, доўга і ўважліва ўглядаецца ў засмучана-напружаныя твары жанчын-рабочых...

Святое аблічча іконы Сафіі — сімвал Мацярынства. Гімнам гучаць цудоўныя вершы Ігара Севяраніна...

Дакументальны фільм «Пяю табе, мая сяброўка» (студыя «Летапіс», «Беларусьфільм», аўтары сцэнарыя В. Пісарэнка, М. Князеў, рэжысёр М. Князеў, аператар І. Шумейка).

На першы погляд аўтары нічога новага ў сваім фільме гледачу не прапануюць. Але чаму так напружана працуе мозг і душу хвалююць самыя розныя пачуцці? Фільм—своеасаблівы зварот да жанчын, зварот пасрэдніцтвам выяўленчага раду і музыкі. Жанчыне прапанавана паназіраць за сабой збоку. Але не павярхоўным поглядам староннягa, а жадаючы дапамагчы зразумець, усвядоміць, што, акрамя яе самой ніхто не дапаможа ёй, што толькі яна сама мае магчымасць змяніць сваё становішча ў лепшы бок і, тым самым, выратаваць чалавецтва ад духоўнага знясілення.

Гэтая думка аўтараў дакументальнай стужкі «Пяю табе, мая сяброўка» гучыць ва ўнісон з адным з вядомых «Лістоў з Амерыкі» выдатнай жанчыны нашага веку, вучонага і філосафа Алены Іванаўны Рэрых: «У руках жанчыны выратаванне чалавецтва і планеты. Жанчына павінна ўсвядоміць сваё значэнне, сваю вялікую місію Маці Свету і рыхтавацца несці адказнасць за лёсы чалавецтва».

Так, Вільгельм III, які сцвярджаў, што жыццё жанчыны трымаецца на «трох К»—кіндэр, кюхе, кірхе (дзеці, кухня, царква),—даўно памёр, як і той, хто сказаў Соф'і Кавалеўскай: «Справа жанчыны — дарыць свету матэматыкаў, а не станавіцца імі». За доказамі таго, што ў Савецкім Саюзе жанчына амаль ва ўсім — нароўні з мужчынам, далёка хадзіць не трэба. Да рэвалюцыі 80 працэнтаў усіх працуючых жанчын былі хатнімі прыслугамі або батрачылі, і толькі 4 працэнты працавалі ва ўстановах аховы здароўя і асветы. А цяпер кожны трэці інжынер у нас—жанчына, і трэць дэпутатаў у Вярхоўным Савеце—жанчыны, сярод членаў партыі іх каля чатырох мільёнаў і каля пяці тысяч носяць званне Героя Сацыялістычнай Працы. Аж дух захоплівае! Вось гэта так!

І ўсё ж... Наўрад ці хто будзе захапляцца, убачыўшы жанчыну, якая ўкладвае асфальт або перамешвае бетонны раствор. А, пагадзіцеся, падобнае ў нас не так рэдка сустракаецца. Ці не вельмі далёка мы зайшлі ў падобным раўнапраўі?

У фільме жанчынам задаюць пытанне, чаму б ім не пакінуць гэту работу, не падшукаць больш лепшае месца, дзе паветра больш чыстае і фізічна лягчэй? Ды прывыклі ўжо, адказваюць. Прыйшлі сюды дзеля кватэр, а пакінуць работу цяпер—узрост не той. Ды і зарплата нядрэнная—сям'ю ж карміць трэба.

Замкнёнае кола. Хворае грамадства параджае такія ж хворыя праблемы. Тыя ў сваю чаргу яшчэ адны і яшчэ... І хто, як не жанчына, спыніць гэтую жудасную ланцуговую рэакцыю, пакуль не прывяла яна да выбуху.

«Маці, якая дае жыццё, ахоўвае яго, няхай стане Маці Вядучай, Надзяляючай і Усёпрымаючай».

**А. КРАЎЧАНКА.**

Футбол

## Хацець і магчы

НАПЭЎНА, той, хто глядзеў рэпартаж з Харкава аб сустрэчы мінчан з «Металістам», адразу заўважыў пэўныя кадравыя змены ў «Дынама». Па-першае, на поле каманду з капітанскай павязкай вывеў Віктар Сокал. Хаця Андрэй Зыгмантовіч, былы капітан, таксама гуляў. Па-другое, як стала вядома, з «Дынама» адлічаны Аляксандр Мятліцкі і Сяргей Шырокі, Мятліцкі ў свой час паспытаў ужо такую кару, але пра цяперашнія прычыны яго і Шырокага раставання з камандай, напэўна, будзе час пагаварыць больш падрабязна пасля вяртання «Дынама» ў Мінск. Цяпер цяжка разважаць, наколькі такая крайняя мера дапаможа вывесці каманду з крызісу, бо гульня ў Харкаве нічога новага ў арсенал мінчан не дабавіла. Чарговае паражэнне, на гэты раз з лікам 0:1. Хаця трэба адзначыць, што сустрэчу дынамаўцы пачалі бадзёра, навязалі сваю гульню і, здавалася, нарэшце, перарвуць абрыдлую нізку няўдач. Каб дайшло да таго, што «трэці тайм» нават прыза «За самы прыгожы гол» не мог вызначыць за адсутнасцю такіх у апошні месяц — хто б гэта прадбачыў? І не пра гол-прыгажун размова ўжо ідзе, самага звычайнага, працоўнага, хаця б рыкашэтам ад суддзі — і таго няма. Не забілі мінчане і «Металісту», хаця маглі. Ды толькі гэта розныя рэчы — хацець і магчы. Мінчане хацелі забіць, а змаглі прапусціць. Хаця і не павінны былі. Памыліўся варатар, які няўдала адбіў мяч пасля дальняга ўдару нападаючага гаспадароў Есіпава, і пакуль нашы абаронцы вырашалі свае асабістыя стратэгічныя задачы, а карацей кажучы, спалі, настойлівы Ралючэнка апярэдзіў усіх і забіў гол. Была 74-я мінута гульні.

Пасля гэтага «Металіст» неяк «ажыў», захапіў ініцыятыву і ўпэўнена давёў сустрэчу да перамогі. Але прасцей за ўсё абвінаваціць у няўдачы аднаго. У дадзеным выпадку варатара. Толькі ці правільна гэта будзе? Бо зрэшты, калі падлічваць памылкі кожнага з удзельнікаў гульні, то ў Сацункевіча іх, упэўнены, будзе найменш. Таму не трэба шукаць таго, хто з краю. Каб уся каманда не аказалася на гэтым месцы. Бо перамогу трэба шукаць ля чужых варот. А вось тыя, хто гэта павінен рабіць, нападаючыя, сваю гульню ніяк знайсці не могуць. Няхай я буду далёкі ад арыгінальнасці, але хочацца паўтарыць, што для перамогі трэба забіць на адзін мяч больш за саперніка.

А наступны праціўнік «Дынама» не падарунак — «Спартак». Прэтэнзій да яго ў мінчан шмат. Так што 10 верасня ёсць вельмі добры шанц выказаць спартакаўцам усю сваю незадаволенасць жыццём і пазмагацца. А галоўнае, нарэшце, рэалізаваць сваё жаданне. Каб, як кажуць, і хацелася, і маглося.

**І. КАХНОВІЧ.**

